Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Рэктар установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
____________Ю.Я. Раманоўскі
«30» ____06_______2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-99/23/уч.

**МОДУЛЬ «МОВАЗНАЎСТВА»**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
**6-05-0731-01 «Геадэзія»**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе вучэбнага плана ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» для спецыяльнасці 6-05-0731-01 «Геадэзія», рэгістрацыйны №21-23/уч. ФІТ ад 04.04.2023 г.

СКЛАДАЛЬНІК:
Т.Р. Багарадава, дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
З.І. Траццяк, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў;
І.С. Даўгіх, дырэктар установы адукацыі «Полацкая дзяржаўная гімназія №1 імя Ф. Скарыны».

РЭКАМЕНДАВАНА ДЛЯ ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 9 ад «09» 06 2023 г.)

Метадычнай камісіяй факультэта інфармацыйных тэхналогій установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 6 ад «28» 06 2023 г.)

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 6 ад «30» 06 2023 г.)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй. Мова з'яўляецца галоўным інструментам інфармацыйнага ўздзеяння, фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму, ажыццяўлення сацыяльнага ўзаемадзеяння.

Асаблівасці сацыялінгвістычнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, павышэнне матывацыі публічнай маўленчай дзейнасці патрабуюць ад вышэйшай школы рыхтаваць не толькі спецыяліста, але і камунікатыўна развітую асобу, білінгвальна падрыхтаваную, якая на дастатковым узроўні можа наладжваць зносіны на нацыянальнай мове ў прафесійна-справавой і навуковай сферах.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» далучае навучэнцаў да сістэмы нацыянальных каштоўнасцей, спрыяе аваладанню на высокім узроўні маўленчай культурай у прафесійных зносінах, садзейнічае лагічнасці, выразнасці, правільнасці і дакладнасці маўлення будучага спецыяліста. У працэсе навучання студэнты авалодваюць спецыяльнай тэрміналагічнай лексікай, вучацца граматна, лагічна і паслядоўна выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах, дарэчна карыстацца моўнымі нормамі ва ўмовах білінгвізму, у залежнасці ад мэтаў камунікацыі працаваць з прафесійна арыентаванымі і навуковымі тэкстамі, весці дакументацыю, выступаць з публічнымі прамовамі і навуковымі паведамленнямі. Аваладанне студэнтамі праграмай вучэбная дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» будзе спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны:** выпрацаваць у студэнтаў на першай ступені вышэйшай адукацыі якасныя ўменні і навыкі эфектыўнага выкарыстання моўных сродкаў у прафесійнай камунікатыўнай дзейнасці.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны:**

-замацаваць і ўдасканаліць веды па беларускай літаратурнай мове ў яевуснай і пісьмовай формах;

-садзейнічаць выпрацоўцы ўмення арыентавацца ўтэарэтычных і практычных праблемах функцыянавання беларускай мовы;

-стварыць цэласнае сістэмнае ўяўленне аб функцыянаванні мовы ў яе стылявых разнавіднасцях;

-садзейнічаць фарміраванню і павышэнню культуры маўлення, у тым лікупрафесійнага, будучых спецыялістаў;

-дапамагчы выпрацаваць уменні і навыкі самастойнага аналізу моўных з'яў;

-спрыяць узбагачэнню слоўнікавага запасу навучэнцаў;

-удасканаліць навыкі і ўменні яка снага і дакладнага перакладу спецыяльных тэкстаў з рускай мовы на беларускую і наадварот;

-спрыяць выпрацоўцы ў студэнтаў навыкаў правільнага, дакладнага, чыстага, выразнага і разнастайнага маўлення;

-сфарміраваць уменне мэтазгоднага выкарыстання сродкаў беларускай мовы ў навуковай і практычнай дзейнасці;

-заахвочваць да практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці;

-выхоўваць павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, фарміраваць імкненні да перспектыўнага развіцця беларускай мовы;

-спрыяць фарміраванню камунікатыўна развітой асобы, здольнай наладжваць кантакты на нацыянальнай мове.

Змест вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» карэлюецца са зместам вучэбных дысцыплін «Замежная мова» (знаёмства з найноўшымі тэхналогіямі), «Філасофія» (асветнікі Беларусі).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны навучэнец павінен:

***ведаць*:**

-ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі асобы; месца і ролю беларускай мовы ў славянскім свеце;

-паходжанне і этапы развіцця беларускай мовы, фарміраванне яе графічнай сістэмы;

-персаналіі заснавальнікаў беларускай лінгвістыкі;

-функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, іх жан-равыя разнавіднасці;

-спецыфіку сістэмы функцыянальных стыляў беларускай літаратурнай мовы;

асаблівасці фарміравання навуковага стылю;

-адметнасці навуковага і афіцыйна-справавога стыляў і сфераў іх прымянення;

структуру лексікі беларускай мовы;

-асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай;

-сістэму літаратурных нормаў беларускай мовы;

***умець*:**

-характарызаваць асаблівасці функцыянальных стыляў;

-ствараць тэксты розных жанраў, свядома карыстаючыся моўным матэрыялам, адэкватна стылю, мэце, сітуацыі і тэме выказвання;

-выкарыстоўваць стылістычныя нормы, згодна з сітуацыяй прафесійныхабо справавых зносін;

-аналізаваць асаблівасці беларуска-рускага і руска-беларускага білінгвізму; -інтэрпрэтаваць моўную палітыку дзяржавы ў гістарычным кантэксце;

-аналізаваць моўную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе;

***валодаць навыкамі і ўменнямі*:**

-эфектыўных маўленчых паводзін у розных сітуацыях прафесійных і справавых зносін;

-карыстацца моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці; адэкватна перакладаць навуковыя, спецыяльныя і службовыя тэксты з рускай на беларускую мову і наадварот, улічваючы стылістычную прыналежнасць і асаблівасці лексіка-граматычнай будовы тэксту;

-кампрэсіі і разгортвання навуковай інфармацыі, анатавання, рэферыравання і рэдагавання;

-пісьменнага афармлення справавых дакументаў.

Студэнт павінен набыць наступную *кампетэнцыю:*

*універсальную:*

УК-10: Выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца: усяго вучэбных гадзін – 108, з іх 34 гадзіны аўдыторных заняткаў (практычныя заняткі – 34 гадзіны), самастойная праца студэнтаў –74 гадзіны. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 3 заліковыя адзнакі.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца ў 1 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Модуль 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.**

Тэма 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Уводзіны ў дысцыпліну «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Месца курса ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, яго сувязь з іншымі дысцыплі- намі (гісторыяй літаратурнай мовы, лексікалогіяй, стылістыкай і культурай маўлення).

Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV–XVI стст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Новая (сучасная) беларуская мова XIX – пачатку XX стст. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI стст.

Тэма 2. Сучасная беларуская мова.

Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў. Беларуская нацыянальная мова і яе формы. Сацыяльна-палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы на сучасным этапе. Дзяржаўная мова і дзяржаўнае двухмоўе (праблема беларуска-рускай інтэрферэнцыі. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь».

**Модуль 2. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.**

Тэма 1. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.

Лексікалогія як прадмет. Лексічнае значэнне слова. Тыпы лексічных значэнняў. Лексічная сістэма беларускай мовы.

Паняцці «тэрмін», «тэрміналагічная сістэма», «тэрміналогія». Галіновыя тэрміналагічныя сістэмы. Узаемасувязь тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лек- сікі (тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя). Асаблівасці тэрмінаўтварэння. Тэрміны, запазычаныя з іншых моў, іх асваенне беларускай мовай.

Крыніцы фарміравання беларускай тэрміналогіі. Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе.

Тэма 2. Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы.

Лексіка спрадвечна беларуская і запазычаная. Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: актыўная і пасіўная лексіка. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.

Тэма 3. Прафесійная лексіка.

Прафесійная лексіка (адміністрацыйнае кіраванне, дзяржава і грамадства, дзяржава і права, маркетынг і менеджмент). Лексічныя, фразеалагічныя, мар-

фалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. Лексічны практыкум (пераклад прафесійных тэкстаў).

Тэма 4. Лексікаграфія.

Прадмет і задачы лексікаграфіі. Тыпы слоўнікаў. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі, іх роля і месца ў лексікаграфічнай сістэме беларускай мовы. Сістэма падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

1. З гісторыі беларускай навуковай тэрміналогіі.
2. Тэрміналагічная лексікаграфія 20–30-х і 90-х гадоў XX ст. (рэфераты студэнтаў).

**Модуль 3. Асаблівасці суіснавання беларускай і рускай моў у розныя гістарычныя перыяды.**

Тэма 1. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму.

Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі.

Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адметнасць структуры словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

Тэма 2. Арфаэпічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім.

Назоўнік. Несупадзенне ў родзе, ліку, скланенні. Асаблівасці скланення прозвішчаў, імёнаў, геаграфічных назваў. Прыметнік. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных формаў у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннікі. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Лічэбнік. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі.

Тэма 3. Арфаграфічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы (працяг вывучэння).

Дзеяслоў. Спецыфіка спражэння. Ужыване суфіксаў дзеясловаў. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Асаблівасці і утварэння і ўжывання ў беларускай мове. Спосабы перадачы дзеепрыметнікаў у складзе тэрміналагічных словазлучэнняў пры перакладзе на беларускую мову. Прыслоўе. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання формаў ступеней параўнання ў адрозненне ад рускай мовы.

**Модуль 4. Стылістыка і культура мовы.**

Тэма 1. Функцыянальныя стылі маўлення.

Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў. Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы (акадэмічны), навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.). Функцып навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сітаксічныя асаблівасці. Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны, дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стлю і яго характэрныя асаблівасці. Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асаблівасці. Узаемапранікненне стыляў.

Тэма 2. Навуковы стыль.

Асноўныя рысы навуковага стылю. Моўныя сродкі навуковага стылю. Паняцце аб прадмове навук: матэматыкі, эканомікі, права, медыцыны і г.д. Рэальны слоўнік кожнай прадмовы. Выкарыстанне невербальных сродкаў (табліцы, графікі, схемы).

Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення, іх афармленне. Абзац як структурная адзінка тэксту. Цытаты і спасылкі, як афармленне.

Тэма 3. Сістэма жанраў навуковай літаратуры.

Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, тэзісы, рэзюме і інш.).

Прынцыпы разгортвання інфармацыі ў навуковым тэксце. Выдзяленне асноўнай і дадатковай інфармацыі.

Кампазіцыйная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата. Віды анатацый. Складанне анатацый тэкстаў па спецыяльнасці па вызначаных мадэлях (дзе?; аналізуецца што?; адзначаецца што?; падкрэсліваецца што?).

Жанр рэзюме і яго асаблівасці.

Тыповыя лексіка-сінтаксічныя канструкцыі рэфератаў, тэзісаў. Лексіка-граматычныя мадэлі выражэння ацэнкі зместу працы, мовы, стылю; афармленне вывадаў, высноў.

Практыкум: напісанне анатацыі, рэферата, рэзюме.

Тэма 4. Афіцыйна-справавы стыль.

Асноўныя рысы *афіцыйна*-справавога стылю. Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю. Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Загаловак і іншыя рэквізіты як элементы тэксту службовага дакумента. Роля клішыраваных выразаў у арганізацыі тэксту службовых дакументаў.

Тэма 5. Афіцыйна-справавыя дакументы.

Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракт, справавыя лісты і інш.). Групы афіцыйна-справавых дакументаў (асабістыя, распарадчыя, адміністрацыйна-*арганізацыйныя*, *інфармацыйна*-даведачныя, справавыя лісты, фінансавыя і ўліковя дакументы), іх кампазіцыйнае і моўнае афармленне. Віды запісу тэкстаў: лінейны запіс, трафарэт, анкета, табліца, тэкст-аналаг.

Правілы афармлення дакумента. Выкарыстанне скарачэнняў у тэкстах дакументаў. Паняцце рэквізіта, фармуляра, бланка.

Спосабы выкладання матэрыялу ў дакуменце: канстатацыя, паведамленне, апісанне. Патрабаванні да іх. Суразмернасць частак дакумента. Рубрыкацыя: абзацы, намараванне, загалоўкі, падзагалоўкі. Практыкум па складанні афіцыйных папер.

**Модуль 5. Культура прафесійнага маўлення.**

Тэма 1. Мова і маўленне.

Мова і маўленне. Віды, тыпы і адзінкі маўлення. Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне.

Паняцце культуры маўлення. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць.

Тэма 2. Дакладнасць выказвання і моўныя нормы.

Правільнасць маўлення і моўныя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і г.д.). Тыповыя маўленчыя памылкі іх прычыны, спосабы выпраўлення. Роля СМІ і мастацкай літаратуры ў фарміраванні стэрэатыпаў паводзін, культуры. Тэхніка і выразнасць маўлення (голас і маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.).

Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты, міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці.

Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўня якасці – паказчыкі паспяховага выступлення.

Тэма 3. Маўленчы этыкет і культура зносін (дыскусія).

Этыкет маўлення. Культура дыскусійна-палемічнага маўлення. Спрэчка-дыскусія-палеміка-дыспут-дэбаты, іх паняце і характарыстыка. Віды і прымы спрэчкі. Выкарыстанне ацэначных моўных сродкаў у спрэчцы.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

### Дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар модуля (раздзела), тэмы, заняткаў | Назва модуля (раздзела), тэмаў, пераліквывучаемых пытанняў | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) | Лабараторныя заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнта | | |
| 1. | **Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей** | | **4** | | | | |
| 1.1. | **Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей**<br>1. Уводзіны ў дысцыпліну «Беларуская мова(прафесійная лексіка)».<br>2. Мова і соцыум.<br>3. Функцыі мовы ў грамадстве.<br>4. Развіццё іфункцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI стст. | | 2 | | | [6, 17] | Вуснае апытанне |
| 1.2 | **Сучасная беларуская мова**<br>1. Беларуская мова – форма нацыянальнайкультуры беларусаў. | | 2 | | | [13, 17] | Вуснае апытанне |
| 2 | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.** | | **8** | | | | |
| 2.1 | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы**<br>1. Тыпы лексічных значэнняў.<br>2. Паняці «тэрмін», «тэрміналагічная сістэма», «тэрміналогія».<br>Асаблівасці тэрмінаўтварэння, іх крыніцы. | | 2 | | | [6, 12, 13] | Пісьмовае апытанне |
| 2.2 | **Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы**<br>1. Лексіка спрадвечна беларуская і запазычаная. | | 2 | | | [6, 13] | Самастойная работа |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання, актыўная іпасіўная лексіка. | | | | | | |
| 2.3 | **Прафесійная лексіка**<br>1. Спецыяльная лексіка як частка лексічнайсістэмы беларускай літаратурнай мовы.<br>Лексічныя, фразеалагічныя, марфалагічныя ісінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. | | 2 | | | [3, 12, 13, 16] | Вуснае апытанне<br>Пераклад прафесійных тэкстаў* |
| 2.4 | **Лексікаграфія**<br>1. Тыпы слоўнікаў.<br>2. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі.<br>Сістэма падачы тэрмінаў у слоўніках. | | 2 | | | [6, 14] | Складанне студэнтамі прафесійных слоўнікаў<br>Рэфераты* |
| 3 | **Асаблівасці суіснавання беларускай і рускай моў у розныя гістарычныя перыяды.** | | **6** | | | | |
| 3.1 | **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму**<br>1. Паняцце білінгвізму.<br>Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму,віды інтэрферэнцыі. | | 2 | | | [1, 6, 9] | Пісьмовае апытанне |
| 3.2 | **Арфаэпічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы**<br>1. Арфаэпічныя нормы і прычыны іх парушэння.<br>2. Назоўнік. Асаблівасці скланення прозвішчаў,імёнаў і геаграфічных назваў.<br>3. Скланенне займеннікаў, лічэбнікаў; асаблівасці іх ужывання. | | 2<br>2 | | | [6, 11<br>10, 14] | Вуснае апытанне<br>Пераклад* |
| .4 | **Стылістыка і культура мовы.** | | **10** | | | | |
| 4.1 | **Функцыянальныя стылі маўлення**<br>1. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.<br>2. Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі.<br>Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныяпадстылі. | | 2 | | | [20] | Пісьмовае апытанне |
| 4.2 | **Навуковы стыль**<br>1. Асноўныя рысы і моўныя сродкі навуковагастылю.<br>Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага | | 2 | | | [6, 20] | Вуснае апытанне<br>Пераклад |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | выступлення, іх афармлення. | | | | | | навуковага тэксту* |
| 4.3 | **Сістэма жанраў навуковай літаратуры**<br>1. Жанравая разнастайнасць навуковага стылю.<br>2. Прынцыпы разгортвання інфармацыі ўнавуковым тэксце.<br>3. Кампазіцыйная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата, артыкула, рэзюме і г.д. | | 2 | | | [3, 10 , 14] | Напісанне анатацыі, рэферата, рэзюме * |
| 4.4 | **Афіцыйна-справавы стыль**<br>1. Асноўныя рысы і моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю.<br>Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. | | 2 | | | [3 , 10, 20] | Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў |
| 4.5 | **Афіцыйна-справавыя дакументы**<br>1. Віды афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>Групы афіцыйна-справавых дакументаў | | 2 | | | [6, 10] | Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў |
| 5 | **Культура прафесійнага маўлення.** | | 6 | | | | |
| 5.1 | **Мова і маўленне**<br>1. Віды, тыпы і адзінкі маўлення.<br>2. Прафесійна арыентаванае маўленне.<br>Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення. | | 2 | | | [1, 9, 14] | Вуснае апытанне |
| 5.2 | **Дакладнасць выказвання і моўныя нормы**<br>1. Правільнасць выказвання і моўныя нормы.<br>Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны,спосабы выпраўлення. | | 2 | | | [1, 9, 13 , 9, 12] | Праслухоўванне і аналіз наву- ковых паведам-ленняў і публічных прамоў студэнтаў* |
| 5.3 | **Маўленчы этыкет і культура маўлення(дыскусія)**<br>1. Што уключае ў сябе паняцце «моўныэтыкет»?<br>2. Вашы меркаванні пра культуру ў грамадстве,культуру свайго асяроддзя, сваю культуру?<br>3. Якi стыль кiраўнiка для вас прыемлiмы: дырэктыўны (аўтарытарны), дэмакратычны (калегіяльны), ліберальны (анархічны)? і інш. | | 2 | | | [8] | Дыскусія |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **УСЯГО:** | | **34** | | | | |

***Мерапрыемствы бягучага кантролю**

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1.Беларуская мова (прафесійная лексіка) : вучэб.-метад. дапам. для студ. БНТУ : у 4 ч. Ч. 2 : Навуковы тэкст: структура, жанры, моўнае афармленне / Л. А. Гіруцкая [и др.] ; М-ва адукацыі РБ, Бел. Нац. тэхн. ун-т, каф. бел. і рус. моў ; пад рэд. Л. А. Гіруцкай. - Мінск : БНТУ, 2006. - 151 с.

2.Беларуская мова (прафесійная лексіка) : вучэб.-метад. дапаможнік для студ. БНТУ : у 4 ч. Ч. 3 : Лексікалогія і лексікаграфія. Беларуская навуковая тэрміналогія / М-ва адукацыі РБ, Бел. Нац. тэхн. ун-т, каф. бел. і рус. моў ; пад рэд. Л. А. Гіруцкай. - Мінск : БНТУ, 2008. - 139 с.

3.Ляшчынская, В. А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2003

4. Пятрова, Н. Я. Беларуская мова. Прафесійная лексіка : метадыч дапаможнік для студ. Міжнар. ін-та дыстанцыйнай адукацы БНТУ / Н. Я. Пятрова, Г. В. Цеплікава ; Мін-ва адукацыі РБ, Бел. нац. тэхн. ўн-т. - Мінск : БНТУ, 2011. - 57, [1] с.

**Рэпазіторый установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны універсітэт»**

5.Беларуская мова (прафесійная лексіка): вуч.-метад. комплекс для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей / С. А. Вялюга, А. І. Зянько. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 264 с. // Электронная бібліятэка УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» - Электронны рэсурс http://elib.psu.by:8080/handle/123456789/13575.

**Дадатковая:**

6.Беларуская мова, інтэрнет і камп'ютэр : матэрыялы круглага стала міжнар. сімпозіума "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі" (20 мая 2002 г., г. Мінск) / Таварыства бал. мовы імя Ф. Скарыны ; склад. С. Кручкоў. - Мінск : БелСаЭС Чарнобыль, 2002. - 66, [2] с. : іл.

7.Буракова, М. У. Анамастыка, тэрміналогія і фразеалогія : вучэбна-метадычны дапаможнік / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукцыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". - Мінск : РІВШ, 2011. - 165 с. - Бібліягр. : с. 128-132. - Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)".

8.Кулікові, У. І. Правілы сучаснай беларускай арфаграфіі : Вучэбны дапаможнік / У. І. Куліковіч. - Мінск : Новое знание, 2011. - 222 с.

9.Ляшчынская, В. А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэбны дапа-можнік / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.

10.Ляшчынская, В. А. Сучасная беларуская мова: фразеалогія : вучэбны дапаможнік / В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукцыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". - Мінск :

РІВШ, 2010. - 229 с. - Библиогр. : с. 168-177. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі РБ у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па філалагічных спецыяльнасцях.

11.Маршэўская, В. В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для юрыстаў і эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. В. Маршэўская, А. С. Садоўская. - Мінск : РІВШ, 2020. - 231 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па юрыдычных і эканамічных спецыяльнасцях.

12.Руденко Е. Н. Белорусский язык. Профессиональная лексика : учеб. пособие для студ. вузов / Е. Н. Руденко, А. А. Кожинова, Е. Г. Задворная. - Мн. : ТетраСистемс, 2005. - 381 с.

13.Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. – Мінск. 1999

**Слоўнікі:**

14. Арашонкава, Г. У. Кароткі слоўнік беларускай мовы. Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. – Мінск, 1994.

15. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1996–2004.

16. Булыка, А. М Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск, 1999.

17. Геаграфічныя паняцці і тэрміны: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: М. М. Курловіч і інш. . – Мінск, 1993.

18. Граматычны слоўнік дзеяслова. – Мінск, 2007.

19. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. . – Мінск. 1995.

20. Руска-беларускі слоўнік: у 3 т. – Мінск, 1995.

21. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / пад рэд. М. В. Бірылы. – Мінск, 1987.

22. Социологическая энциклопедия / под. общ. ред. А. Н. Данилова. – Минск, 2003.

23. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск, 1977–1984.

24. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – Мінск, 2005.

25. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

26. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1983–1986.

27. Этнаграфія Беларусі. – Мінск, 1989.

28. Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік. – Мінск, 1992.

**Інтэрнэт-рэсурсы:**

http://belazar.info/
http://dict.scask.ru/
https://translate.google.com/?hl=be
https://translate.yandex.ru/
https://www.skarnik.by/
http://www.slounik.org/

Гуркова Е. В.

# ПЕРАЛІК ТЭМ РЭФЕРАТАЎ

1. Родная мова – душа народа.
2. Мова і гістарычная памяць.
3. Руплііўцы на ніве роднай мовы.
4. Беларусы ў свеце.
5. Паходжанне назвы Белая Русь.
6. Нашы славутыя землякі.
7. Вядомыя беларускія лінгвісты.
8. Выдатныя дзеячы беларускай культуры.
9. Мой любімы пісьменік.
10. Мой любімы твор.
11. Народнае дойлідства Беларусі.
12. Сімволіка беларускіх народных песень.
13. Традыцыйныя народныя святы.
14. Старонкі беларускага народнага календара.
15. Геаметрычныя фігуры (іх назвы ў беларускай і рускай мовах).
16. «Фізікі» і «лірыкі».
17. Псіхалогія публічнага выступлення.

## ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАЛІКА

1. Беларуская нацыянальная мова, яе формы. Функцыі мовы ў грамадстве.
2. Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы.
3. Паняцце моўнай нормы. Сістэма норм літаратурнай мовы.
4. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.
5. Некаторыя аспекты функцыянавання беларускай і рускай моў. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння.
6. Марфалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
7. Сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. Адрозненні ў будове некаторых словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах.
8. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.
9. Навуковы стыль, яго функцыі і характэрныя асаблівасці.
10. Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (даклад, артыкул, рэферат,анатацыя, рэзюмэ), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення.
11. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
12. Афіцыйна-справавыя дакументы, правілы іх напісання і афармлення.
13. Мова і маўленне. Віды і тыпы маўлення. Адзінкі маўлення.
14. Дакладнасць выказвання і моўныя нормы.Маўленчы этыкет і культура зносін.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Змест самастойнай працы студэнтаў
(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| Від самастойнай працы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | Модуль 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых інацыянальных каштоўнасцей. | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2. | **Сучасная беларуская мова.**<br>Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме “Сацыяльна-палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы на сучасным этапе”.<br>**Літаратура**: да ўсіх тэм асноўная літаратура -- Беларуская мова (прафесійная лексіка): вуч.-метад. комплекс для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей / С. А. Вялюга, А. І. Зянько. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 264 с. // Электронная бібліятэка УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» - Электронны рэсурс http://elib.psu.by:8080/handle/123456789/13575 | 4 |
| | Модуль 2. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2. | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.**<br>Праца з прафесійнымі тэкстамі – лексічны аналіз слоў. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Спецыяльная лексіка.**<br>Пераклад сказаў са сферы інфарматыкі на беларускую мову. Праца з электроннымі перакладчыкамі (Google translate, Yandex-перакладчык, Belazar). | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення.**<br>Складанне тэрміналагічнага слоўніка па спецыяльнасці. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Спосабы і сродкі ўтварэння тэрмінаў розных галін дзейнасці.**<br>Складанне тлумачальнага слоўніка прафесійнай лексікі. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Прафесійная лексіка.**<br>Вывучэнне тэрміналагічнай базы матэматыкі | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| | на беларускіх рэсурсах (slounik.org). | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 4. | **Лексікаграфія.**<br>- Складанне тлумачальнага слоўніка прафесіянальнай лексікі. | 4 |
| | Модуль 3. Асаблівасці суіснавання беларускай і рускай моў у розныя гістарычныя перыяды | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2. | **Арфаэпічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.**<br>Аналіз памылак, якія дапускаюцца людзьмі ў часкарыстання беларускай мовай. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 3 | **Арфаграфічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы (працяг вывучэння).**<br>Аналіз і пераклад прафесійнай лексікі і тэкстаў | 4 |
| | Модуль 4. Стылістыка і культура мовы | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 4. | **Афіцыйна-справавы стыль.**<br>Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 4. | **Прыемы рэдагавання навуковага тэксту.**<br>Анатацыя. Напісанне анатацыі. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 4. | **Кампазіцыйна-структурная арганізацыя тэкста навуковага стылю.**<br>Аналіз структуры навуковага тэксту. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 4. | **Жанры навуковай літаратуры.**<br>Курсавая работа: структура, моўная спецыфіка. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 5. | **Афіцыйна-справавыя дакументы**.<br>Афіцыйна-справавы стыль.<br>Скаданне афіцыйных папер. | 4 |
| | Модуль 5. Культура прафесійнага маўлення | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 1. | **Мова і маўленне.**<br>Аналіз стылёвых асаблівасцей тэкстаў, адпаведнасць маўленчым сітуацыям. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2. | **Дакладнасць выказвання і моўныя нормы.**<br>Аналіз навуковых паведамленяў і публічных прамоў студэнтаў. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 3. | **Маўленчы этыкет і культура зносін.**<br>Падрыхтоўка да дыскусіі. | 4 |

| | | |
|---|---|---|
| Падрыхтоўка да кантрольнай работы №1. | Модуль 2.<br>**Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.**<br>Падрыхтоўка да лексічнага практыкуму (пераклад прафесійных тэкстаў). | 4 |
| Падрыхтоўка да кантрольнай работы №2. | Модуль 3.<br>**Асаблівасці суіснавання беларускай і рускай моў урозныя гістарычныя перыяды.**<br>Сістэма жанраў навуковай літаратуры.<br>Падрыхтоўка да практыкуму:напісанне анатацыі,рэферата, рэзюме (на выбар). | 4 |
| | Усяго гадзін | 74 |

## КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

Дыягностыка кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца падчас выступу студэнтаў на практычных занятках, правядзення тэстаў па асобных раздзелах вучэбнай дысцыпліны, вуснага апытання падчас практычных заняткаў, абароны рэфератаў, здачы заліку.

У рамках рэйтынгавай сістэмы паспяховасць студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне ацэньваецца з дапамогай мерапрыемстваў бягучага кантролю, якія праводзяцца на працягу семестра. Мерапрыемствы бягучага кантролю праводзяцца ў час аўдыторных заняткаў. Адзнакі, атрыманыя студэнтам у ходзе бягучага кантролю, выстаўляюцца па дзесяцібальнай шкале і фіксуюцца ў журнале выкладчыка. Для студэнта, які прапусціў мерапрыемства бягучага кантролю па ўважлівай прычыне, кафедрай устанаўліваюцца дадатковыя тэрміны. Студэнтам, якія прапусцілі мерапрыемства бягучага кантролю без уважлівай прычыны, выстаўляецца 0 (нуль) балаў за гэтае мерапрыемства.

Вынік бягучага кантролю за семестр ацэньваецца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале і выводзіцца зыходзячы з адзнак, выстаўленых выкладчыкам (выкладчыкамі) падчас правядзення мерапрыемстваў бягучага кантролю на працягу семестра. Дадзеная адзнака таксама ўлічвае вынікі ўдзелу студэнта ў навукова-практычных мерапрыемствах, вучэбна-даследчай, навукова-даследчай працы студэнтаў (канферэнцыях, семінарах, алімпіядах, конкурсах, навуковых гуртках і г.д.) па профілю дысцыпліны і можа быць павышана да 10 балаў пры дасягненні значных вынікаў у гэтай працы.

Пры правядзенні міжсесійнай атэстацыі ў адпаведнасці з графікам навучальнага працэсу ў рэйтынгавую (атэстацыйную) ведамасць уносіцца бягучая адзнака па дзесяцібальнай шкале, выведзеная па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю, праведзеных з пачатку семестра да моманту атэстацыі.

Пры правядзенні прамежкавай атэстацыі (заліку) адзнака «залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі па накапляльнай сістэме па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю выніковую адзнаку ад 4 да 10 балаў, адзнака «не залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі ад 1 да 3 балаў. Апошнія здаюць залік другі раз па прапанаваных пытаннях да заліку.

## ПРАТАКОЛ ЎЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне,прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| | Кафедра геадэзіі і геаінфарма-цыйных сістэм | нет | |

Загадчык кафедры
геадэзіі і геаінфармацыйных сістэм
к.т.н., дацэнт К.І. Марковіч

# РЭЦЭНЗІЯ

на вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне
«Беларуская мова (прафесійная лексіка)»
для спецыяльнасці6-05-0731-01 «Геадэзія»

Аўтар-складальнік: дацэнт кафедры сусветнай літаратуры
і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт» Т.Р. Багарадава

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» прызначана для студэнтаў першага курса спецыяльнасці 6-05-0731-01 «Геадэзія».

Праграму адрознівае арыентацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, істотнае ўзмацненне ролі самастойнай працы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Асноўнымі мэтамі навучання студэнтаў у ВНУ з'яўляецца падрыхтоўка высокапрафесійных спецыялістаў ў галіне народнай гаспадаркі і фармаванне шэрагу кампетэнцый.

Галоўнай мэтай выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» з'яўляецца выкананне спецыфічнай ролі ў падрыхтоўцы спецыялістаў, што будуць працаваць у геадэзічнай сферы.

З аднаго боку, дысцыпліна сістэматызуе веды, набытыя ў агульнаадукацыйнай школе, а з другога – рыхтуе да ўспрымання цыклу лінгвістычных дысцыплін і дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу.

Праграма, што рэцензуецца, адпавядае адукацыйнаму стандарту па спецыяльнасці. Яна мае дакладную структуру згодна з патрабаваннямі, паказанымі для дакументаў дадзенага тыпу.

Са сказанага вышэй вынікае мэтазгоднасць рэкамендацыі рэцэнзуемай праграмы ў якасці вучэбнай па спецыяльнасці «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для спецыяльнасці 6-05-0731-01 «Геадэзія».

Доктар філалагічных навук,
прафесар кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў
установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай» З.І. Траццяк

**РЭЦЭНЗІЯ**
на вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне
«Беларуская мова (прафесійная лексіка)»
для спецыяльнасці 6-05-0731-01 «Геадэзія»

Аўтар-складальнік: дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў
установы адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт імя Еўфрасінні Полацкай"
Т.Р. Багарадава

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для спецыяльнасці 6-05-0731-01 «Геадэзія» вывучаецца на першым курсе ў першым сяместры.

Асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў у вышэйшай навучальнай установе з'яўляюцца фармаванне і развіццё кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-вартасным і сацыяльна-творчым вопыце, што забяспечваюць вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Дадзеная дысцыпліна заклікана адыграць пазітыўную ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, у прапагандзе дасягненняў і набыткаў нацыянальнага мастацтва слова.

Праграма перш за ўсё скіравана на працэс ўдасканалення асобы, выхаванне ў маладога пакалення асноў сістэматызацыі ведаў, напрацоўку новых падыходаў да ведання беларускай мовы, а таксама на развіццё творчага мыслення студэнтаў, актывізацыю іх навукова-даследчага пошуку.

Асноўныя мэты курса:
- удасканаленне філалагічнага мыслення студэнтаў;
- павышэнне пісьменнасці студэнтаў, культуры іх мовы;
- развіццё маўленчых ўменняў і навыкаў;
- выхаванне павагі да мастацкага слова, духоўнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай годнасці.

Курс прадугледжвае практычныя заняткі, а таксама самастойную працу студэнта з выкарыстаннем розных форм кантролю ведаў.

Прапанаваная праграма ўтрымлівае ўсе адпаведныя патрабаванням раздзелы: тлумачальную запіску, тэматычны план з указаннем аўдыторных гадзін, апісанне вучэбнага матэрыялу з пералікамі тэм і пытанняў, вучэбна-метадычную частку.

Рэцэнзаваная праграма адпавядае адукацыйнаму стандарту па спецыяльнасці. Зыходзячы са сказанага вышэй, мэтазгодна рэкамендаваць рэнцэнзуемую праграму ў якасці вучэбнай па спецыяльнасці 6-05-0731-01 «Геадэзія».

Дырэктар установы адукацыі
«Полацкая дзяржаўная гімназія
№1 імя Ф. Скарыны». І.С. Даўгіх